# § 5. Геапалітыка, месца ў сістэме геаграфічных навук

***Успамінаем.*** Што такое палітычная геаграфія? Што з'яўляецца аб'ектам вывучэння палітычнай геаграфіі? Якія асноўныя рысы палітыка-геаграфічнага становішча Рэспублікі Беларусь?

***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Для чаго сучаснай дзяржаве неабходна выпрацоўваць геастратэгіі? Якія пытанні складаюць сферу інтарэсаў палітычнай геаграфіі і геапалітыкі? Якімі ведамі павінен валодаць сучасны спецыяліст у галіне геапалітыкі?

**Геапалітыка, месца ў сістэме навук.** Адным з асноўных напрамкаў палітычнай геаграфіі з'яўляецца геапалітыка. З'явілася яна ў выніку аналізу міжнародных адносін з выкарыстаннем геаграфічных ведаў на рубяжы XIX–XX стст.

***У свеце ўсё ўзаемазвязана.*** Заснавальнікам геапалітыкі лічыцца Арыстоцель, які паказваў на геапалітычную ролю астравоў і пісаў, што в. Крыт па сваім становішчы прызначаны для пануючага ўплыву на Грэцыю. Ці згодны вы са сцвярджэннем Арыстоцеля? Прывядзіце аргументы «за» і «супраць» гэтага выказвання.

Адно з першых азначэнняў, дадзеных у перакладзе з грэчаскай мовы, характарызавала геапалітыку як навуку аб геаграфічнай абумоўленасці розных палітычных працэсаў.

Шведскі географ Р. Чэлен (1864–1922) быў першым, хто ўвёў паняцце «геапалітыка» (мал. 29).



Мал. 29. Р. Чэлен, аўтар тэрміна «геапалітыка»

**Геапалітыка — раздзел палітычнай геаграфіі, які вывучае геаграфічныя адносіны паміж цэнтрамі палітычнай сілы ў свеце і залежнасць знешняй і ўнутранай палітыкі дзяржаў і міжнародных адносін ад сістэмы палітычных, ваенна-стратэгічных, эканамічных, экалагічных фактараў і палітыка-геаграфічнага становішча краіны.**

Аб'ектам геапалітыкі як навукі з'яўляюцца планетарная прастора з дзяржавамі, іх межамі і рэсурсамі, а таксама геапалітычныя працэсы і з'явы ў сусветнай супольнасці і ў часе. Прадметам геапалітыкі выступаюць узаемаадносіны паміж геапалітычнымі суб'ектамі (мал. 30) пры вырашэнні сусветных і рэгіянальных праблем.




Мал. 30. Асноўныя суб'екты геапалітыкі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 31. Асноўныя паняцці геапалітыкі

Асноўнымі паняццямі ў геапалітыцы выступаюць: прастора, баланс сіл, інтарэс і экспансія. Кожнае паняцце дазваляе ацаніць дзяржаву па розных прыкметах (мал. 31).

**Прастора ў геапалітыцы.** Асноўным у геапалітыцы з'яўляецца паняцце «прастора». Упершыню яно з'явілася ў працах нямецкага вучонага Ф. Ратцэля ў канцы XIX ст. і нясе больш шырокі сэнс, чым тэрыторыя.

У геапалітыцы галоўнае значэнне мае *кантроль над прасторай*.

**Прастору, якая кантралюецца дзяржавай або аб'яднаннем дзяржаў, называюць геапалітычным полем.**




Мал. 32. Асноўныя віды геапалітычных палёў

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вылучаюць чатыры асноўныя віды геапалітычных палёў (мал. 32). Напрыклад, эндэмічным полем для Францыі з'яўляюцца арэалы рассялення старажытных плямёнаў продкаў сучасных французаў — галаў. Прыкладам пагранічнага поля выступаюць аддаленыя раёны Расіі — Усходняя Сібір і Далёкі Усход. Тэрыторыя былога СССР з'яўляецца перакрыжаваным полем для Садружнасці незалежных дзяржаў, народы якіх пражывалі ў некалькіх рэспубліках (напр., рускія ў БССР, рускія ў Казахстане, беларусы ў Расіі). Прыкладам метапалёў могуць лічыцца Еўропа (якая асвойваецца ЕС і НАТА) і Паўднёва-Усходняя Азія.

***Папрацуем з атласам***. Выкарыстоўваючы карты атласа і матэрыялы вучэбнага дапаможніка, назавіце пяць дзяржаў свету з найбольш «моцнай» пазіцыяй у свеце з улікам актуальных геапалітычных крытэрыяў.

**Геапалітычныя фактары развіцця краіны.** З цягам гістарычных падзей змяняецца месца краіны ў геапалітычнай прасторы свету. Аднак яно будзе вызначацца шэрагам пастаянна дзеючых фактараў (мал. 33).




Мал. 33. Геапалітычныя фактары развіцця краіны

Эканамічна развітыя краіны і шэраг краін, якія развіваюцца, імкнуцца ў цяперашні час заняць больш моцную пазіцыю ў свеце. Таму яны надаюць увагу найбольш актуальным геапалітычным крытэрыям: долі ў сусветным валавым прадукце, кантролю над стратэгічнымі сегментамі сусветнага рынку, канвертавальнасці валюты, валоданню ракетна-ядзернай зброяй, удзелу ў асваенні космасу, інавацыйнаму патэнцыялу эканомікі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

| Галоўныя геапалітычныя працэсы ў свеце ў канцы XX – пачатку XXI ст. | |
|---|---|
| | **1.** Распад у 1990-я гг. сацыялістычнай сістэмы гаспадарання і звязаныя з гэтым узброеныя канфлікты і геапалітычныя змены ў Еўропе і на постсавецкай прасторы (краіны Балтыі, Украіна, Малдова, Паўднёвы Каўказ, Цэнтральная Азія) |
| | **2.** Завяршэнне фарміравання Еўрасаюза, які адыгрывае ўсё больш сур'ёзную геапалітычную і эканамічную ролю ў свеце |
| | **3.** Пашырэнне зоны ваеннага блока НАТА за кошт краін Балтыі, Усходняй Еўропы і Балкан, прамы ўдзел узброеных кантынгентаў краін — удзельніц НАТА ў ваенных аперацыях за межамі блока (Балканы, Афганістан, Ірак, Паўночная Афрыка) у 1990–2000 гг. |
| | **4.** Эканамічны і ваенна-палітычны прарыў Кітая ў сферу глабальнай эканомікі і геапалітыкі |
| | **5.** Узброеныя канфлікты і ваенна-палітычныя крызісы на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы |
| | **6.** Павышэнне ваенна-палітычнай напружанасці вакол Афганістана і Ірана, якая стварае перадумовы для ўзнікнення небяспечных ачагоў нестабільнасці свету |
| | **7.** Рост сепаратызму, марское пірацтва і нарошчванне маштабаў тэрарызму (Нью-Ёрк, Вашынгтон, Лондан, Мадрыд і інш.) |

Мал. 34. Галоўныя геапалітычныя працэсы ў свеце ў канцы XX – пачатку XXI ст.

**Галоўныя геапалітычныя працэсы ў свеце ў канцы XX – пачатку XXI ст.** Геапалітычныя працэсы ўяўляюць з сябе гістарычныя працэсы фарміравання, развіцця, узаемадзеяння і распаду суб'ектаў геапалітыкі. Яны складаюць свайго роду аснову сусветнай гісторыі.

З канца XX ст. па першае дзесяцігоддзе XXI ст. адбыліся падзеі, якія аказалі ўплыў на глабальную геапалітычную карціну, змянілі баланс сіл, які склаўся ў свеце, і спрыяюць узнікненню новых выклікаў і пагроз. Да іх ліку адносяць сем асноўных падзей (мал. 34).

У сучасным свеце можна вылучыць сем асноўных геапалітычных цэнтраў сілы: ЗША, Расія, Еўрапейскі саюз, Кітай, мусульманскі свет, Японія, Індыя. Гэта глабальныя і рэгіянальныя геапалітычныя гульцы, уплыў якіх у сучасным свеце найбольш прыкметны.

**Электаральная геаграфія.** Электаральная геаграфія з'яўляецца адным з найбольш традыцыйных напрамкаў палітычнай геаграфіі, якія актыўна развіваюцца.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Гэты напрамак узнік у Францыі на пачатку XX ст. працай А. Зігфрыда «Палітычны агляд захаду Францыі ў часы Трэцяй рэспублікі». У ёй аўтар упершыню ўстанавіў заканамернасці паміж прыроднымі характарыстыкамі і вынікамі выбараў у заходняй частцы Францыі. Таму гістарычна электаральная геаграфія вывучала геаграфію выбараў і тэрытарыяльную расстаноўку палітычных сіл.

**Электаральная геаграфія — напрамак палітычнай геаграфіі, які вывучае тэрытарыяльныя адрозненні ў палітычных перавагах выбаршчыкаў, выніках выбараў і ўплыў грамадскіх, эканамічных, рэлігійных, этнічных фактараў на іх выніі.**

Вывучэнне геаграфіі выбараў немагчыма без усебаковых ведаў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі той тэрыторыі, на якой гэтыя выбары праходзяць, і палітычных працэсаў, якія прывялі да іх вынікаў. Таму для развіцця электаральнай геаграфіі патрэбна ведаць як сацыяльна-эканамічную і палітычную геаграфію, так і гісторыю, эканоміку і сацыялогію.

У электаральнай геаграфіі вылучаюць *тры асноўныя раздзелы*. Першы вывучае геаграфію галасавання, другі — геаграфію фактараў галасавання, трэці — геаграфію прадстаўніцтва партый у выбарных органах улады.

Геаграфія выбараў залежыць ад гісторыка-культурных асаблівасцей тэрыторыі (гісторыка-культурных расколаў паміж нацыямі, сацыяльнымі групамі і інш.). На яе таксама ўплываюць сацыяльна-эканамічныя адрозненні паміж тэрыторыямі ў межах краіны.

Каштоўны зыходны матэрыял электаральнай статыстыкі па выбарчых акругах з'яўляецца вельмі важным для палітычнай геаграфіі і надзвычай цікавым для ўсіх палітычных сіл у кантэксце свайго ўплыву ў краіне. Таму адным з важных вынікаў геаграфіі выбараў з'яўляецца іх картаграфаванне (мал. 35).




Мал. 35. Геаграфія вынікаў рэферэндуму аб незалежнасці Латвіі ў 1991 г.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Падвядзём вынікі.** Геапалітыка з'яўляецца раздзелам палітычнай геаграфіі, які вывучае ... .

Асноўнымі суб'ектамі геапалітыкі выступаюць дзяржава, ..., ..., ... і інтэграцыйнае аб'яднанне.

Галоўнымі паняццямі ў геапалітыцы з'яўляюцца ..., ..., ... . Геапалітычнымі фактарамі развіцця краіны з'яўляюцца ... . Галоўнымі геапалітычнымі працэсамі ў свеце з'яўляюцца ... .

Прастора, якая кантралюецца дзяржавай або аб'яднаннем дзяржаў, называецца ... .

Электаральная геаграфія займаецца вывучэннем пераваг выбаршчыкаў і вынікаў выбараў.

***Праверым свае веды.*** 1. Хто ўвёў у навуковы ўжытак тэрмін «геапалітыка»? 2. Якімі даследаваннямі займаецца геапалітыка? 3. Якое значэнне электаральнай геаграфіі для сучасных палітычных працэсаў?

П$_1$

***Ад простага да складанага.*** Ці з'яўляюцца, на ваш погляд, геаграфічныя ўмовы галоўнымі для вызначэння шляхоў далейшага развіцця дзяржавы?

***Падарожжа па Глабальнай сетцы.***
Сайт «Электаральная геаграфія».

Правообладатель Адукацыя і выхаванне